ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

СТУДЗЕНЬ

Віцебск 2013

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Студзень

Інфармацыйнае паведамленне

2013 г.

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Рэдактар *В. М. Нявейкава*

Камп'ютарная вёрстка *А. В. Юпатавай*

Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Надрукавана на ксераксе ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна"

210601, Віцебск, Леніна, 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

У Цэнтры нацыянальных рамёстваў г. Полацка працавала персанальная выстаўка майстра вышыванкі *Алены Шушарт* “Па сцяжынках народнага календара” і выніковая выстаўка работ майстроў клубаў “Роднасць” і “Рошва” “Жыве ў народзе творчасць”.

Выстаўка вышыўкі бісерам “Дивны дела твои, Господи…” *Ірыны* і *Анастасіі Чалышавых* размясцілася ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”».

Віцебскі рабочы. – 2013. – 26 студз. – С. 8.

Майстар лозапляцення Дабрамысленскага Дома культуры Лёзненскага раёна *Ірына Шаўцова* ў **студзені** стала членам ГА “Беларускі саюз майстроў народнай творчасці”.

Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2013. – 29 студз. – С. 1, 3.

Выстаўка работ членаў клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў “Докша” “Калядныя ўзоры” адкрылася ў **студзені** ў Докшыцкім раённым Доме рамёстваў.

Родныя вытокі (Докшыцы). – 2013. – 9 студз. – С. 4.

КІНАМАСТАЦТВА

22 студзеня ў кінатэатры “Минск” г. Наваполацка прайшла прэмьера фільма “Секрет моего повара”, галоўную ролю ў якім сыграў навапалачанін *Павел Дубрынскі*.

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Студзень

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : студзень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2012. – 25 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, 2013

Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка **18 студзеня** прадставіў у выставачнай зале абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці выніковую выстаўку народнага клуба майстроў і мастакоў “Прамень” (кіраўнік *Нэлі Радзько*). Яна прымеркавана да пацвярджэння калектывам звання “народны”. У экспазіцыю пад назвай “Адвечнае” ўвайшлі новыя работы ўдзельнікаў клуба, якія дэманструюць таленты народных умельцаў. Работы выкананыя ў розных тэхніках – салома- і лозапляценне, мастацкі роспіс па тканіне і дрэве, ткацтва і вышыўка, ганчарства. Цікавасць гледачоў выклікаў батлеечны тэатр з лялькамі ручной работы. У выкананні наваполацкіх юнакоў і дзяўчат гучалі беларускія народныя песні.

Віцебскі АМЦНТ

30–31 студзеня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці прайшоў абласны семінар кіраўнікоў аматарскіх лялечных тэатраў. Падчас мерапрыемства былі абмеркаваны вынікі абласнога свята-конкурсу аматарскіх лялечных тэатраў “Лялечны свет”, адбылося знаёмства з вопытам работы пераможцаў гэтага конкурсу: народным лялечным тэатрам “Вытворяшки” (Пастаўскі РДК) і народным тэатрам лялек “Капялюш” (Наваполацкі Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры). Змястоўная праграма для ўдзельнікаў семінара была падрыхтавана Беларускім тэтрам “Лялька”: экскурсія па тэатры, прагляд спектакляў “Аладзін”, “Хлопчык і цень”, майстар-класы мастацкага кіраўніка Беларускага тэатра “Лялька”, заслужанага дзеяча мастацтваў *В. І. Клімчука*, вядучых майстроў сцэны *А. Маханькова* і *Н. Шабанавай* .

Віцебскі АМЦНТ

У Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры **25 студзеня** адкрылася выстаўка каляровых пано “Лоскутный вернисаж”. У экспазіцыі прадстаўлены 60 работ майстроў клуба “Рошва” Полацкага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур.

kraj.by/belarus/news/kultura/-braslavskie-masteritsi-vladeyut-tehnikoy-loskutnogo-shitya-foto-2013-01-31

“Дама с собачкой”, “Фотограф”, “Девочка с зонтиком”, “Наездница” і іншых, якія сталі ўпрыгожваннем мінскіх вуліц. У Віцебску таксама ёсць работа гэтага аўтара – помнік Герою Савецкага Саюза А. Міроненку, які загінуў у Афганістане. Вечар у тэатральнай гасцінай прайшоў у дзень нараджэння У. Жбанава, якому споўнілася б 59 гадоў. У мінулым годзе хвароба абарвала яго жыццё. Ён быў не толькі скульптарам, але і паэтам, пісьменнікам. У аснову пастаноўкі ў тэатры Я. Коласа лягла яго аповесць “Рыжий, будем жить!”, якую ажыццявіў маскоўскі рэжысёр *Аляксандр Дольнік*. Успамінамі аб У. Жбанаве падзяліліся сябры і калегі.

http://nspaper.by/2013/01/25/vecher-pamyati-v-zhbanova-sostoyalsya-v.htm

30 студзеня выставачная зала “Духаўскі круглік” запрасіла жыхароў горада на творчую сустрэчу **“Коласаўцы: учора, сёння, заўтра”**. Героямі сустрэчы сталі акцёр, народны артыст Беларусі *Тадэвуш Кокштыс* і літаратурны рэдактар *Святлана Дашкевіч*. Сустрэча – унікальная магчымасць даведацца пра тое, што адбываецца па другі бок занавесу сёння і чаго чакаць гледачу ад тэатра ў будучыні.

http://www.gck.by

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

Вечарына **“Святкі на Калядкі”** адбылася **14 студзеня** ў абласным метадычным цэнтры народнай творчасці і сабрала шмат гасцей, якія прыйшлі адзначыць традыцыйнае народнае свята, а весяліць віцебскую публіку прыехалі ўдзельнікі народнага клуба нацыянальнай кухні, беларускага фальклору і гульні “Дубровенскія прысмакі” (мастацкі кіраўнік *Інэса Крукоўская*). Гледачы ахвотна ўключаліся ў вясёлыя калядныя гульні, разам з выканаўцамі спявалі калядныя песні, дзяўчыны варажылі на жаніхоў. Удзельнікі клуба пачаставалі гасцей стравамі традыцыйнай беларускай кухні. Падарункам для гледачоў стала выступленне народнага ансамбля народных інструментаў у саставе выкладчыкаў ДМШ № 4 г. Віцебска (кіраўнік *Алена Мезенцава*).

Народнае слова. – 2013. – 12 студз. – С. 3.

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 студзеня 2013 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Бешанковіцкай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Лепельскай, Лёзненскай, Міёрскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Шумілінскай раённых сетак бібліятэк, Віцебскай, Полацкай і Наваполацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

На працягу **студзеня** ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі працавала выстаўка “Броня и оружие” – гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі беларускага Сярэднявечча (народны тэатр гістарычнага касцюма “Полоцкий союз”, г. Полацк).

У Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з **28 снежня** праходзіць выстаўка жывапісу “Размова з уласным ценем, альбо Гульня з колерам…” заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, уладальніка дзясяткаў міжнародных прэмій і дыпломаў за лепшае афармленне кніг, ганаровага акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў, старшыні Беларускага саюза мастакоў, прафесара *Уладзіміра Пятровіча Савіча.*

http://gallery.polotsk.museum.by/be/node/32891

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

На камернай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа **23 студзеня** прайшоў **“Вечар адыграных роляў”**, прысвечаны памяці вядомых артыстаў-коласаўцаў. На вечарыне ўзгадалі пра заслужанага артыста БССР *Баляслава Сяўко*, заслужанага работніка культуры БССР *Якава Буракова*, народных артыстаў Беларусі *Іосіфа Матусевіча*, *Уладзіміра Куляшова*, *Яніну Глебаўскую* і *Галіну Маркіну*, *Фёдара Шмакава* і *Мікалая Міцкевіча*, былога дырэктара тэатра *Геральда Асвяцінскага*, артыста *Сяргея Казлова*. Гледачы ўбачылі ўрыўкі са спектакляў, што ўвайшлі ў залаты фонд драмтэатра: “Улада цемры”, “Трыбунал”, “Зацюканы апостал”, “Званы Віцебска”, “Энергічныя людзі”, “Матухна Кураж і яе дзеці”, “Заставайцеся сонцам”, “Кастусь Каліноўскі”, “Позняе каханне”.

У **студзені** на сцэне тэатра Я. Коласа адбыліся гастролі Маскоўскага тэатра аперэты, салісты якога прадставілі віцебскаму гледачу аперэту *Мікалая Стрэльнікава* “Холопка”.

26 студзеняў у тэатры Я. Коласа прайшоў вечар памяці вядомага беларускага скульптара *Уладзіміра Жбанава*, аўтара вядомых скульптур

(г. Віцебск), *Уладзіміра Макаркова* (г. Мінск) і *Дзмітрыя Лаўрэнцьева* (г. Рыга).

http://chagal-vitebsk.com/?q=node/304

З **15 студзеня** ў Мастацкім музеі Віцебска працавалі дзве выстаўкі, прысвечаныя 75-годдзю Віцебскай вобласці. На юбілейнай экспазіцыі прэзентаваны больш за 100 карцін, у якіх адбілася гісторыя Віцебшчыны, яе пейзажы, архітэктурныя помнікі. У выстаўцы "Віцебск. Амаль паўстагоддзя таму назад" прадстаўлены работы, творцы якіх былі непасрэднымі ўдзельнікамі і сведкамі аднаўлення горада на Дзвіне ў 1940–1970 гадах. А экспазіцыя "Віцебшчына ў творах мастакоў пачатку XXI стагоддзя" адмыслова "расказвае" гледачам пра сучаснае мастацтва як велізарную, складаную сферу, у якой выяўлены разнастайныя напрамкі, дзе хаатычна перамяшаны гістарычны вопыт і эксперыментальныя пошукі творцаў.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 17 студз. – С. 15.

У **студзені** ў Цэнтры сучаснага мастацтва адкрылася выстаўка работ мастачкі *Таццяны Нагавіцынай*.

Витебский проспект. – 2013. – 24 студз. – С. 19.

У Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адбылося адкрыццё выстаўкі графікі "Ціхі палёт" *Таццяны Барысевіч*.

http://news.vitebsk.cc/2013/01/24/v-vitebskom-rayonnom-istoriko-kraevedcheskom-muzee-sostoyalos-otkryitie-vyistavki-grafiki-tatyanyi-borisevich

У выставачнай зале Музычнай гасцінай фатограф *Васілій Акунёў* прадставіў выстаўку "Стихия огня и фантазии", усе фотаздымкі зроблены ў майстэрні беларускага мастака па метале *Аляксандра Чульбы*.

Витебский проспект. – 2013. – 31 янв. – С. 19

У **студзені** ў Мастацкім музеі Віцебска адкрылася выстаўка па выніках пленэра памяці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. У экспазіцыю ўвайшлі 56 твораў. Да таго ж выстаўку папоўнілі ўнікальныя прадметы з мемарыяльнага комплексу пісьменніка, якія захоўваюцца ў фондзе абласнога краязнаўчага музея.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 янв. – С. 5.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

З **4** па **8 студзеня** ў Празе прайшоў VIII міжнародны дзіцяча-юнацкі фестываль-конкурс Cristal Fairy ("Хрустальная фея"). Арганізатарам творчага свята выступіла вядучая еўрапейская кампанія ў галіне фестывальнага руху і правядзення маладзёжных праграм Patria Voyages. r. o. (Чэшская Рэспубліка). Конкурс праводзіўся ў розных намінацыях у чатырох узроставых групах, удзельнічалі больш за 700 юных музыкантаў і танцораў з Чэхіі, Беларусі, Расіі і Украіны. Аркестр рускіх народных інструментаў "Отрада" (мастацкі кіраўнік *У. Шышоў*) Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага заваяваў Гран-пры фестывалю. Салістам аркестра *Кірылу Ячмянёву* (балалайка) і *Сяргею Яшчуку* (баян) прысуджаны званні лаўрэатаў першай ступені, а *Ігару Мрочку* – другой ступені. Вакальны ансамбль Cjuntutti акадэмічнага хору (мастацкі кіраўнік *Аляксандр Суворaў)* стаў лаўрэатам другой ступені ў намінацыі "Акадэмічны вакал". Дзіцячыя калектывы і салісты Віцебскага абласнога Палаца дзяцей і моладзі таксама ярка праявілі сябе. Выхаванкам *Алены Фальковіч* – эстраднай вакальнай групе "Капели" прысуджана званне лаўрэата першай ступені, эстрадна-вакальнай групе "Ассоль" уручаны дыплом I ступені. Таксама дыпломамі былі адзначаны салісты *Соф'я Тарасава* (дыплом II ступені), *Кацярына Мазур* (дыплом II ступені), *Дар'я Дзенісенка* (дыплом I ступені). Узорны вакальна-харавы калектыў "Двина" (мастацкі кіраўнік *Вольга Фальковіч*) заслужыў дыплом II ступені, адзначаны і салісткі *Ульяна Брылёва* (лаўрэат III ступені), *Ангеліна Джаранава* (дыплом III ступені).

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 янв. – С. 6.

Народны маладзёжны тэатр “Колесо” Цэнтра культуры “Віцебск” яшчэ ў канцы **лістапада** ў Астане дапамагаў запальваць цэнтральную навагоднюю елку Рэспублікі Казахстан. А ансамбль танца “Лявоніха” і ансамбль гарманістаў “Добродеи” **7 студзеня** ў г. Вялікія Лукі (Расія) прынялі ўдзел у святочным канцэрце, прысвечаным Ражаству Хрыстову, “Звезда Рождества” ў Вялікалуцкім драматычным тэатры. Народны ансамбль цымбалістаў “Гарэзлівыя перазвоны” ў рамках праекта “Рождественские встречи” даў канцэрты ў гарадах Берлін, Дзюсельдорф, Брэмен, Майнц, Максдорф і інш.

http://www.gck.by//

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

7 студзеня работнікамі РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна праведзена раённае свята “Каляда-калядзіца”, у якім удзельнічалі народны фальклорны калектыў “Суседзі” Аболецкага ДФ і вакальны калектыў Славенскага СК, асобныя выканаўцы Усвіж-Букскага ПДК, Талачынскага ГДК, Райцаўскага СДК.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

11 студзеня ў аграгарадку Сваташыцы тэлеканал “Беларусь-1” зняў фільм пра народны абрад Каляды, удзел у здымках прыняў дубровенскі народны калектыў “Кудзеліца” і народны клуб нацыянальнай кухні і беларускай гульні “Дубровенскія прысмакі”.

13 студзеня на сцэне Пастаўскага Дома культуры з сольным канцэртам выступіў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фальклорны ансамбль “Паазер’е”.

Пастаўскі край. – 2013. – 12 студз. – С. 1.

17 студзеня ў РДК Дубровенскага раёна адбыўся справаздачны канцэрт творчых калектываў “Подарок в Рождество”.

Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2013. – 30 студз. – С. 1.

ДКУ “Столичный театр” (г. Масква).

http://philharmonic.vitebsk.by/ru/afisha/720-yanvar-2012.html

У трэці раз абласная філармонія абвясціла набор у **“Калядную музычную акадэмію”**. Канцэртна-адукацыйны праект пад такой назвай, які стартаваў у 2011 годзе, выклікаў вялікую цікавасць у жыхароў і гасцей Віцебска. Адкрыўся канцэртны цыкл у гэтым годзе ў філармоніі **29 студзеня** выступленнем студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (клас прафесара *Л. С. Шаламенцавай*), якія ўжо сталі лаўрэатамі міжнародных конкурсаў. У рамках “Акадэміі” адбыўся таксама канцэрт аднаго з найбольш таленавітых маладых прадстаўнікоў беларускай фартэпіяннай школы *Аляксея Пятрова*. Гэты музыкант заваяваў прэстыжныя залы многіх краін, адзіны з беларускіх артыстаў меў магчымасць выступіць на адной з лепшых канцэртных пляцовак свету – у зале Берлінскай філармоніі. *А. Пятроў* – стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і Міжнароднага фонду “Новыя імёны”. У яго выкананні прагучалі творы Моцарта, Шапэна, Брамса, Шумана, Скрабіна. Пачулі аматары класікі і выступленні маладых і таленавітых музыкантаў, выпускнікоў навучальных устаноў Беларусі, якія цяпер студэнты Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага *Андрэя Іванова* (фартэпіяна) і *Аляксея Дулава* (скрыпка). Жадаючыя змаглі наведаць майстар-класы па фартэпіяна выкладчыкаў *Л. С. Шаламенцавай* і *А. Пятрова*. **1 лютага** адбыўся гала-канцэрт удзельнікаў праекта і філарманічнага сімфанічнага аркестра. Свой уклад у работу “Каляднай музычнай акадэміі” ўнеслі і юныя мастакі. Навучэнцы віцебскай дзіцячай мастацкай школы № 1 падрыхтавалі выстаўку “Сімфонія колеру”, якая экспанавалася ў фае філармоніі.

http://nspaper.by/2013/01/25/akademiya-dlya-yunyx-talantov.html

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

З **9 студзеня** па **3 лютага** ў Арт-цэнтры Марка Шагала праходзіла выстаўка “TRINITY”, на якой экспанаваліся работы *Леаніда Мядзведскага*

прызначаная ў светлыя дні Нараджэння Хрыстова.

http://nspaper.by/2013/01/09/v-vitebske-na-rozhdestvo-poyut.html

Адной з самых старажытных традыцый з'яўляецца сустрэча Ражаства святочнымі культурнымі мерапрыемствамі, якія дазваляюць не толькі атрымаць асалоду ад мастацтва, але і надарыць адзін аднаго сардэчнай цеплынёй. Салісты абласной філармоніі ў супрацоўніцтве з дабрачынным каталіцкім таварыствам "Карытас" Віцебскай дыяцэзіі прынялі ўдзел у дабрачынным калядным канцэрце "Слухай сэрцам!", які прайшоў **6 студзеня** ў касцёле св. Варвары.

http://philharmonic.vitebsk.by/

8 студзеня ў канцэртнай зале Сафійскага сабора адбыўся калядны **канцэрт-фестываль харавых калектываў**. Гэта свята музыкі арганізавана ў рамках культурна-адукацыйнага і пазнавальнага турызму па ініцыятыве турыстычнай фірмы "Илва" (г. Віцебск). У канцэрце прынялі ўдзел тры расійскіх калектывы: канцэртны хор "Партес" ДМШ № 79 (г. Масква), мастацкі кіраўнік *Т. Шаўчэнка*, фальклорны ансамбль "Крупица" (г. Масква), кіраўнік ансамбля *І. Богда*, камерны хор "Маленькая капелла", мастацкі кіраўнік і дырыжор *Л. Абшадка*.

http://sophia.polotsk.museum.by/be/node/32919

У 2013 годзе Віцебская абласная філармонія сумесна з Консульствам Латвійскай рэспублікі ў Віцебску адкрывае цыкл "Музычныя вечары Латвіі ў філармоні і «Sveika, Mūzika!»". Мэтай гэтага цыклу з'яўляецца знаёмства з сучаснымі выканаўцамі Латвіі і адкрыццё новых для віцебскіх слухачоў імёнаў. **18 студзеня** канцэртам фартэпіяннай музыкі адкрыў цыкл музычных вечароў *Марыс Жагарс* – таленавіты піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў, аўтар музыкі тэатральных пастановак і кінафільмаў. У выступленні гучала музыка Э. Марыконэ (Gabriels Oboe) і А. Пьяццолла (Libertango).

http://philharmonic.vitebsk.by/ru/philarmonic-vitebsk/news/724-sveika-muzika.html

19 студзеня ў абласной філармоніі маленькім гледачам прадставілі дзіцячую шоу-пародыю на мюзікл "Тры мушкецёры" "Скарбы Ката ў ботах", арганізатарамі якой выступіла кампанія "Интермьюзик" і

Выхаванцы праваслаўнай нядзельнай школы пры Міёрскім храме падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне да свята нараджэння Ісуса Хрыста, якое прадэманстравалі **13 студзеня** ў Міёрскім раённым Доме культуры.

Раждественскі вечар прайшоў у Наваполацкім ГДК, удзел у ім прыняў архіепіскап Полацкі і Глыбоцкі Феадосій.

Тэматычны семінар "Роль самодеятельного театра в воспитании и организации досуга населения" праведзены **23 студзеня** на базе Падсвільскага Дома культуры**.**

raj.by/belarus/news/kultura/-braslavskie-masteritsi-vladeyut-tehnikoy-loskutnogo-shitya-foto-2013-01-31

26 студзеня ў Дубровенскім раёным Доме культуры адбыўся агляд творчых праграм – візітовак раённых цэнтраў Віцебскай вобласці. Ініцыятары мерапрыемства – упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама і ДУ "Віцебскі абласны цэнтр народнай творчасці".

Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2013. – 30 студз. – С. 1.

26 студзеня ў Палацы культуры чыгуначнікаў г. Оршы прайшоў другі тур абласнога агляду-конкурсу "Зорны шлях" з удзелам усіх "заслужаных", "народных" і "ўзорных" калектываў інструментальнага жанру Аршанскага рэгіёну. Былі праслуханы 12 калектываў.

Віцебскі АМЦНТ

Першую ў Беларусі навуковую рэканструкцыю вялікай харугвы з Віцебска сярэдзіны XVII стагоддзя можна ўбачыць у выставачнай зале "Духаўскі круглік". Гэты і іншыя ўнікальныя экспанаты стварылі ўдзельнікі народнага клуба гістарычнай рэканструкцыі "Варгенторн" Цэнтра культуры "Віцебск", прэзентацыя выстаўкі адбылася **31 студзеня.**

http://news.vitebsk.cc/

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

3 студзеня на сцэне Міёрскага раённага Дома культуры ў дванаццаты раз прайшоў **дыяцэзійны конкурс калядных спеваў "Зорка Бэтлеема"**. На мерапрыемства сабраліся ўдзельнікі з розных куточкаў

парафій Віцебскай дыяцэзіі. У конкурснай праграме ўдзельнічалі прадстаўнікі васьмі парафій. Гучалі спевы на беларускай і польскай мовах у разнастайных жанрах: інструментальная кампазіцыя, салісты, дуэты, гурты.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

У Доме культуры пасёлка Акцябрскі **5 студзеня** адбыўся **раённы агляд-конкурс народных абрадаў "Зімовыя святкі"**. У творчым спаборніцтве ўдзельнічалі пяць калектываў: Віцебскі раённы цэнтр рамёстваў "Адраджэнне", Варонаўскі, Акцябрскі, Сушчоўскі, Капцянскі сельскія Дамы культуры. Званне лаўрэата конкурсу журы ў выніку прысудзіла капцянцам.

http://news.vitebsk.cc/category/kultura/

Штогадовы **фестываль мастацкай творчасці Чыгуначнага раёна "Крыніца" 15 студзеня** сабраў удзельнікаў і гасцей у Палацы творчасці дзяцей і моладзі. У першы яго дзень традыцыйна прайшоў этап абласнога конкурсу "Песні юнацтва нашых бацькоў". Лепшыя вакалісты выступілі з творчымі нумарамі. Танцавальныя нумары прадставілі харэаграфічная студыя "Ренессанс", студыя спартыўнага бальнага танца "Аэлита", шоу-тэатр "Карамельки".

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 янв. – С. 5.

19-20 студзеня ў КЗ "Віцебск" праходзіў **XXVIII Міжнародны турнір па спартыўных бальных танцах "Віцебская сняжынка"**. У гэтым годзе танцавальны форум сабраў у паўночнай сталіцы Беларусі 800 пар з 16 краін свету. На конкурс у Віцебск прыехалі танцоры з Фінляндыі, Іспаніі, Турцыі і Грэцыі. Міжнароднае журы ўзначальвалі галоўныя суддзі, прадстаўнікі сусветнай танцавальнай эліты *Пятру Гозун* (Малдова) у катэгорыях "Моладзь" і "Дарослыя" ў турнірах сусветнага класа, а таксама *Бранка Бохак* (Славенія) у турнірах катэгорыі "Юніёры-2". "Сняжынка" прынесла поспех беларускім танцавальным парам – нашы спартсмены з розных гарадоў заваявалі больш за паўсотні прызавых месцаў. Выдатна выступілі віцебскія танцоры, так, напрыклад, дуэт з клуба "Арабеск" *Алега Пятроўскага* і *Марыі Яфімавай* заняў першае

плацяжоў вызвалены: будынак чыгуначнага вакзала, дом № 2 на вуліцы Янкі Купалы, дом № 22/16 на вуліцы Леніна, дом № 14/5 на вуліцы імя газеты "Праўда", дом № 20/13 на вуліцы Суворава, дамы № 2 і № 5 на вуліцы Талстога, дом № 19 на праспекце Фрунзе, дом № 3 на вуліцы Чырвонага Партызана. Таксама ў гэтым спісе будынак БелДРЭС у Арэхаўску (Аршанскі раён), чыгуначны вакзал у в. Бігосава (Верхнядзвінскі раён), будынак Лепельскай ГЭС у г. Лепелі і гістарычны цэнтр Полацка.

http://news.vitebsk.cc/2013/01/08/sherag-gistaryichnyih-budyinkaw-vitsebska-vyizvalenyiya-ad-padatkaw/

МАСТАЦТВА

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

У Віцебску стала добрай традыцыяй сустракаць Каляды духоўнай музыкай. У гэтым годзе фестываль расцягнуўся на тры дні. Пачаўся ён у Калядную Куццю, **6 студзеня**, канцэртам фартэпіяннай і арганнай музыкі ў абласной філармоніі. На наступны дзень адбыўся вялікі канцэрт з удзелам дзіцячых і дарослых калектываў у тэатры імя Якуба Коласа. А **8 студзеня** спевы гучалі ў духоўнай семінарыі і Праабражэнскім храме. Цяжка было аддаць перавагу каму-небудзь з мінулых канцэртаў, але традыцыйна большасць аматараў духоўнай музыкі прыйшлі ў тэатр. Тут выступілі не толькі пастаянныя ўдзельнікі свята – віцебскія пеўчыя калектывы, але і госці з Оршы, Ушач, Мінска, Светлагорска і Масквы. Адзін з арганізатараў свята, настаяцель Свята-Георгіеўскага храма *Мікалай Каляда*, з задавальненнем адзначыў, што духоўная музыка з кожным годам прыцягвае ўсё большую колькасць слухачоў. Пашыраецца кола і ўдзельнікаў фэсту. На гэты раз асабліва запомнілася выступленне ўзорнага хору хлопчыкаў і юнакоў дзіцячай школы мастацтва з Светлагорска, а таксама дзіцячага фальклорнага хору "Крупица" з Масквы, у рэпертуары якога, акрамя калядных песень, – рускія танцы і карагодныя кампазіцыі. У наступным годзе свята духоўнай музыкі ў абласным цэнтры адзначыць 20-годдзе. Сустрэча, як і ва ўсе гэтыя гады,

гадоў таму дзякуючы ўнікальнай акустыцы тут была адкрыта канцэртная зала камернай музыкі, якая стала вядома далёка за межамі горада. У 1985 годзе спецыялісты чэшскай фірмы “Rieger Kloss” усталявалі арган, выраблены па індывідуальным праекце, які арганічна ўліўся ў музейную экспазіцыю помніка архітэктуры і прыцягнуў цікавасць шматлікі аматараў музыкі. На працягу **студзеня-лютага** ў канцэртнай зале Сафійскага сабора праходзяць канцэрты камернай музыкі ў выкананні *Ксеніі Пагарэлай* (фартэпіяна) і Камернага аркестра “Еўропа-Цэнтр”. Дырыжор *Раіль Садыкаў* аб'яднаў разам музыкаў-энтузіястаў, выкладчыкаў і студэнтаў музычных устаноў Полацка і Наваполацка ў камерны аркестр, які неаднаразова прадстаўляў на суд слухачоў разнастайныя канцэртныя праграмы, прымаў удзел у полацкіх фестывалях. *Ксенія Пагарэлая* больш вядомая слухачам як арганістка Сафійскага сабора, а яе фартэпіяннае майстэрства ў спалучэнні з вытанчаным гучаннем камернага аркестра, падорыць аматарам класічнай музыкі шмат новых прыемных уражанняў.

http://museum.by/taxonomy/term/1

У Віцебску пачалася рэканструкцыя музея гісторыі народнага мастацкага вучылішча па вуліцы Праўды, 5а. Рэстаўрацыя гістарычнага будынка ўключана ў гарадскую інвестыцыйную праграму на гэты год.

Будынак канца XIX – пачатку XX стст. на вул. Калініна ў Віцебску, што з ліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў, адкрыўся пасля рэстаўрацыі. У кастрычніку 2011 года аб’ект быў уключаны ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму 2011–2012 гг., і кошт рэканструкцыі склаў 8,4 млрд. рублёў. Падчас работ імкнуліся захаваць стылістыку і аўтэнтычнасць вонкавага выгляду, старую цэглу, аднак пры гэтым надбудавалі мансардны паверх, цалкам змянілі планіроўку ўнутры, інжынерныя сістэмы і вонкавыя сеці.

Народнае слова. – 2013. – 4 студз. – С. 15.

Пастановай Савета Міністраў Беларусі № 1194 ад 22 снежня 2012 года шэраг гісторыка-культурных помнікаў вызвалены ад падатку на нерухомасць, ад зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы. У Віцебску ад гэтых

месца (“Юніёры-2” D Лаціна), *Уладзіслава Крукоўскага* і *Дар'і Шашко* – другое месца (“Дзеці-1” Е4). Два дні ў канцэртнай зале “Віцебск” панавала свята прыгажосці і грацыі, пры аншлагах праходзілі канцэрты. Арганізатарамі “Віцебскай сняжынкі” выступілі Віцебскія аблвыканкам, гарвыканкам, Цэнтр культуры “Віцебск” і як усе ранейшыя гады – клуб спартыўнага танца “Фэст”. Свята праходзіла пад эгідай Сусветнай і Беларускай федэрацый танцавальнага спорту. Генеральны партнёр турніру – ААТ “Белгазпрамбанк”.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 24 янв. – С. 1–2.

24 студзеня ў Аршанскім гарадскім Цэнтры культуры адбыўся абласны этап II рэспубліканскага агляду-конкурсу дзіцячай творчасці “Здравствуй, мир!”.

У Верхнядзвінскім раённым Доме культуры прайшоў “Рождественский фестиваль”. Удзел у ім прынялі прадстаўнікі мясцовых органаў улады, духавенства, выхаванцы нядзельных школ і жыхары горада. Тут размясціліся выстаўкі вучняў дзіцячай школы мастацтваў, Дома рамёстваў і народных майстроў, праваслаўнай літаратуры і царкоўных рэчаў. Госці свята ўбачылі творчыя работы выхаванцаў аддзялення дзённага прыбывання дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў, а таксама змаглі прыняць удзел у дабрачыннай акцыі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва “Ярмарка добра”.

Віцебскі рабочы. – 2013. – 17 студз. – С. 15.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

З 21 па 25 студзеня ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы для бібліятэкараў бібліятэк-філіялаў.

Віцебскі АМЦНТ

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

17 студзеня адкрылася персанальная выстаўка фатаграфій члена

Саюза дызайнераў Беларусі *І. А. Барсукова*.

18 студзеня супрацоўнікі абласной бібліятэкі падрыхтавалі да пасяджэння калегіі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя кніжную выстаўку “Экалогія. Прырода. Жыццё”. У экспазіцыі была прадстаўлена навуковая і папулярная літаратура.

22 студзеня Творчая сустрэча “Кланяюсь в пояс дороге” з намеснікам старшыні Праўлення Маскоўскай гарадской арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі, старшынёй Камісіі па ваенна-мастацкай літаратуры СП Расіі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі РФ, заслужаным работнікам культуры РФ, кандыдатам педагагічных навук, паэтам *У. А. Сілкіным*.

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

14 студзеня Прэзентацыя кнігі “Зовет к Отечеству любовь!”, прысвечанай 200-годдзю Айчыннай вайны 1812 года. Удзел прынялі прадстаўнікі абласнога інстытута развіцця адукацыі, гарадскога аддзялення Цэнтра праваслаўнай асветы імя Прападобнай Еўфрасінні Полацкай, бібліятэчныя работнікі *(бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай)*.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 янв. – С. 11.

17 студзеня Да 75-годдзя Віцебскай вобласці: гістарычная гадзіна “Любімы край, зямля мая” *(бібліятэка імя Я. Маўра)* і краязнаўчы ўрок “Прыдзвінскі край, мая калыска” *(бібліятэка імя І. Крылова)*.

18 студзеня Акцыя “Віцебшчына ў асобах”, у рамках якой адбылася гадзіна мастацтва “Творца, які ажыўляў камень” (да 105-годдзя скульптара З. Азгура), краязнаўчая гадзіна “Вайна на палотнах нашых землякоў”, прысвечаная творам мастакоў П. Явіча, А. Кавалёва, М. Савіцкага *(бібліятэка імя У. Караткевіча)*.

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

22 студзеня Прэзентацыя кнігі вершаў наваполацкага паэта *Феакціста*

Віцебшчыне я спяваю”, прысвечаная 75-годдзю Віцебскай вобласці *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Рэпартаж-агляд і гадзіна паэзіі “Так оставьте ненужные споры..!” да 75-годдзя з дня нараджэння У. Высоцкага *(Пліская сельская бібліятэка)*.

Літаратурны круіз “В поисках золотого ключика” да 130-годдзя з дня нараджэння А. М. Талстога *(Ушацкая дзіцячая бібліятэка)*.

Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк

3 студзеня Гульнёвая праграма “Приключение Буратино” для вучняў школы *(Светласельская сельская бібліятэка)*.

18 студзеня ў чытальнай зале прайшло літаратурнае падарожжа “В гостях у сказки” да 385-годдзя з дня нараджэння казачніка Ш. Перо *(дзіцячая бібліятэка)*.

20 студзеня Пазнавальная гадзіна “Крещение Господне” для ўдзельнікаў краязнаўчага аб’яднання “Гарыслава” *(Мішневіцкая сельская бібліятэка)*.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

З **31 студзеня** ў Чашніцкім гістарычным музеі праходзіць выстаўка, прысвечаная 75-годдзю Віцебскай вобласці, на якой прадстаўлены карціны мастакоў Віцебшчыны: *Я. Батальёнка*, *А. Казлоўскага*, *В. Карабліна* і інш., сярод экспанаў – карты, кнігі, брашуры, альбомы, паштоўкі і сувеніры.

http://museum.by/taxonomy/term/1

У **студзені** ў Музеі беларускага кнігадрукавання экспанавалася выстаўка “Край лясоў і азёр”, падрыхтаваная да 75-годдзя Віцебскай вобласці. На выстаўцы прадстаўлены выданні, якія знаёмяць з гісторыяй Віцебшчыны, а таксама альбомы, прысвечаныя Віцебску, Наваполацку, Полацку, Оршы.

30-годдзе канцэртнай залы Сафійскага сабора – значная падзея ў культурным жыцці не толькі горада Полацка, але і ўсёй Беларусі. Упершыню ў Сафійскім саборы загучала музыка ў 1983 годзе. Роўна 30

на Каляды” *(Волкаўшчынская бібліятэка-клуб)*, літаратурна-музычная вечарына “Прыйшла Каляда!” *(Нікалаёўская сельская бібліятэка)*.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

24 студзеня Эстэтычная гадзіна «“Боярыня Морозова” Василия Сурикова: ещё один взгляд на хорошо известное” з навучэнцамі Пастаўскага прафесійнага каледжа *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

“Разговор об актере, поэте, человеке” – мерапрыемства да 75-годдзя з дня нараджэння У. Высоцкага (*Вярэнькаўская сельская бібліятэка*).

29 студзеня Круглы стол, прысвечаны праблемам чытання дзяцей і моладзі. Удзел у мерапрыемстве прынялі супрацоўнікі раённай і гарадской бібліятэк, дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

raj.by/belarus/news/kultura/-postavskie-bibliotekari-reshali-problemu-ottoka-chitateley-2013-02-04

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

7 студзеня Тэатралізаванае прадстаўленне “Калядная зорка на зялёнкаўскім узгорку” *(Зялёнкаўская сельская бібліятэка)*.

9 студзеня Тэматычны вечар “Под Рождественской звездой” *(Ветрынская гарпасялковая бібліятэка*).

15 студзеня Ранішнік для дзяцей Фарынаўскага прытулку “Крещение Господне – радость и защита”.

Талачынская раённая сетка публічных бібліятэк

З **1** па **14 студзеня** Выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага народнага мастацтва “Калядная зорка” раённага Дома культуры *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэка

Літаратурна-музычная кампазіцыя для старшакласнікаў “Гімн

Фядотава “На маёй радзіме, Беларусі” *(бібліятэка імя А. С. Пушкіна)*.

27 студзеня Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна падвялі вынікі дзесяцігадовай работы па праграме “Солнышко”, распрацаванай для выхаванцаў дзіцячага дома і сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

29 студзеня Творчая сустрэча з беларускім пісьменнікам і гісторыкам *Уладзімірам Арловым*, прэзентацыя кнігі “Краіна Беларусь. Вялікае Княства Літоўскае” *(бібліятэка імя Я. Коласа)*.

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

24 студзеня Сустрэча з паэтам, намеснікам старшыні Праўлення Маскоўскай гарадской арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі *У. А. Сілкіным* і прарэктарам па міжнародных, міжрэгіянальных адносінах міжнароднага Інстытута кіравання (г. Архангельск) *М. П. Собалевым (цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

24 студзеня Літаратурна-гістарычная кампазіцыя “Мой отчий край во всем неповторим” з удзелам членаў літаратурнага аб’яднання “Наддзвінне” *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

21 студзеня Інфармайцыйны ўрок “Зямля Віцебская – старадаўняя і сучасная” у рамках пасяджэння клуба для падлеткаў “Сучаснік” *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

23 студзеня Вусны часопіс “Нужно всем нам научиться, проявив терпение, энергосбережению” *(Слабодкаўская сельская бібліятэка)*.

27 студзеня Гісторыка-інфармацыйная гадзіна “Віцебскія далягляды” ў рамках пасяджэння аматарскага аб’яднання “Кругагляд” *(Відзаўская сельская бібліятэка*).

28 студзеня Гадзіна памяці “Ленинград: реквием жизни и смерти” да 70-годдзя з дня прарыву блакады *(дзіцячая бібліятэка)*.

Бешанковіцкая раённая сетка публічных бібліятэк

17 студзеня Гадзіна фальклору “Я спадчыну ад продкаў атрымаў” у рамках пасяджэння краязнаўчага клуба “Прыдзвінне”, прэзентацыя зборніка “Легенды і паданні маёй Радзімы” *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

21 студзеня Гадзіна мастацтва “Вечна зялёнае дрэва рамёстваў” для аматараў народнай творчасці з удзелам кіраўніка народнага клуба майстроў “Скарбонка” *А. А. Пагарэльскай (цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

18 студзеня Гадзіна паэзіі “Адданы сын сваёй зямлі”, прысвечаная паэту-земляку М. Барэйшу *(Дзёрнавіцкая сельская бібліятэка)*.

25 студзеня Літаратурна-музычная вечарына памяці У. Высоцкага “Я, конечно, вернусь!” *(Асвейская сельская бібліятэка)*.

31 студзеня Вечар памяці У. Высоцкага “Носил он совесть ближе к сердцу” *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

15 студзеня Этнаграфічны калаж “Кола дзён, або Па старонках народнага календара” *(Курынская сельская бібліятэка)*.

18 студзеня Літаратурна-музычная вечарына “Віцебшчына мая сінявокая” *(Капцянская сельская бібліятэка)*.

25 студзеня Вечар памяці “У. Высоцкі – паэт, спявак, акцер” *(Курынская сельская бібліятэка)*.

31 студзеня Адкрыццё выстаўкі творчых работ (габелены, бацік, акварэль) мастачкі *Н. Манцэвіч (Кіраўская сельская бібліятэка)*.

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

Шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, адбыўся ва ўсіх бібліятэках-філіялах Лёзненскай ЦБС:

відэачасопіс “Витебщина на карте Беларуси” *(сельская бібліятэка аграгарадка Надзёжына)*, гістарычны калейдаскоп “Нет роднее Витебской земли” *(сельская бібліятэка аграгарадка Дабрамыслі)*, віртуальная калекцыя “Витебск на советских открытках” *(сельская бібліятэка аграгарадка Зубкі)*, літаратурна-гістарычны экспрэс “Віцебшчына: знаёмая і невядомая” *(цэнтральная раённая бібліятэка)* і інш.

16 студзеня Гадзіна духоўнасці “На Крещение – Великое Водоосвящение” з удзелам іерэя Расціслава *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

27 студзеня Вечар-памяць “Владимир, или Прерванный полет”, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння У. Высоцкага *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

У дзіцячай бібліятэцы прайшоў агляд кніг-юбіляраў 2013 года “Как на книжкины именины”, гадзіна мовы “У роднай мове – цэлы свет. Ты і тваё імя”, літаратурнае дасье “Волшебница из Стокгольма” (па творчасці шведскай пісьменніцы А. Ліндгрэн) і інш.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

6 студзеня Падарожжа “Займальная мінуўшчына” (з гісторыі вёскі Чарэйшчына) *(Чарэйшчынская сельская бібліятэка)*.

9 студзеня Выстаўка работ навучэнцаў нядзельных школ пры храмах і дзіцячай школы мастацтваў г. Лепеля “Рождественские мотивы” *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

16 студзеня Тэатралізацыя па старонках народнага календара “Прыйшла Каляда” з лялечным прадстаўленнем для пацыентаў дзіцячага санаторыя *(дзіцячая бібліятэка)*.

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

У бібліятэках Міёрскай ЦБС адбыўся цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Каляд: калядныя пасядзелкі “Калядная зорка ў небе заззяла” *(Чапукоўская сельская бібліятэка)*, тэматычны вечар “Сустрэчы